# ИСТОРИЯ

УДК 947.2:929.5

**А. А. Дамарад**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

## ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У КАНЦЫ XVIII–XIX СТ. (ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АСПЕКТ)

Артыкул прысвечаны гістарыяграфіі важнай праблемы сацыяльна-палітычнага мінулага: гісторыі дваранства Беларусі (канец XVIII–XIX ст). Разглядаюцца расійскія афіцыйныя даследаванні XIX ст., археаграфічныя, генеалагічныя і геральдычныя даследаванні, зробленыя па ініцыятыве даследчыкаў і па заказе дзяржавы, а таксама гістарыяграфія савецкага перыяду і суверэннай Рэспублікі Беларусь. Асобна вылучаны даследаванні, якія закранаюць гісторыю беларускай шляхты, зробленыя польскімі даследчыкамі на працягу XIX–XX ст.

**Ключавыя словы:** дваранства, генеалогія, дзяржаўная палітыка, геральдыка.

**A. A. Damarad**
Belarusian State Technological University

## THE NOBILITY OF THE BELARUSIAN LANDS IN THE LATE XVIII–XIX CENTURY (HISTORIOGRAPHIC ASPECT)

The article is devoted to the historiography of an important problem of the socio-political past: the history of the nobility of Belarus (late XVIII–XIX centuries). Russian official researches of the XIX century, archeographic, genealogical and heraldic researches made on the initiative of researchers and by the order of the state, and also historiography of the Soviet period and the sovereign Republic of Belarus are considered. The researches concerning the history of the Belarusian nobility made by the Polish researchers during the XIX–XX centuries are separately allocated

**Key words:** the nobility, genealogy, government policy, heraldry.

**Уводзіны.** Беларускія землі ў працэсе свайго гістарычнага развіцця з канца XVIII ст. знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі. Гэта стварала ўмовы для інтэграцыі розных па форме, але аднолькавых па змесце сацыяльных сістэм, уверсе якіх знаходзілася вышэйшае саслоўе – шляхта ў беларускіх землях і дваранства ў Расійскай імперыі. Шляхта ў перыяд разлажэння феадальных адносін складала, зразумела, не асноўную, але вялікую частку насельніцтва (да 10%). Роля, якую яна адыгрывала ў тагачасным грамадскім жыцці, была значнай. Шляхта з'яўлялася верхам сацыяльнай лесвіцы і, па-сутнасці, была сацыяльным лідэрам. Менавіта яна з'яўлялася тагачаснай элітай, вызначала развіццё грамадства. З яе шэрагаў выйшлі рэвалюцыйныя дэмакраты Каліноўскі К., Урублеўскі В., дзеячы беларускай культуры Дунін-Марцінкевіч В., Багдановіч М. і іншыя знакамітыя асобы. З беларускай шляхты паходзяць таксама шматлікія выдатныя дзеячы расійскай гісторыі, навукі, культуры. Натуральна, што гісторыя дваранства Беларусі была прадметам вывучэння навукоўцаў-гісторыкаў.

**Асноўная частка.** Спецыяльна гісторыі дваранства прысвечаны шэраг даследаванняў XIX ст. Найперш неабходна згадаць працу А. М. Рамановіча-Славацінскага «Дворянство в России с XVIII в.», у якой даецца аналіз становішча тагачаснага дваранства ў Расіі [1]. Гэтая праца дазваляе зразумець тыя ўмовы, у якіх апынулася шляхта беларускіх зямель пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Больш позняе даследаванне дваранства Расійскай імперыі належыць барону Корфу С. А. [2]. Аднак у навуковым плане яно значна ўступае згаданаму вышэй. Самым значным вынікам працы С. А. Корфа з'яўляецца асвятленне мясцовых асаблівасцей, якія яскрава праяўляліся ў жыцці беларускай шляхты. Аўтар выдатна апісвае рознасць культурных асяродкаў, з якіх выйшла шляхта былой Рэчы Паспалітай і дваранства ўнутраных губерняў Расійскай імперыі. Вельмі цікавыя факты прыводзіць С. А. Корф таксама наконт карпаратыўнасці шляхты, яе больш высокага культурнага ўзроўню ў параўнанні з расійскім дваранствам. Даследаваў дваранскае саслоўе ў XIX ст. таксама М. Яблачкаў. Яго праца характарызуецца найперш тым,

што ў ёй шляхта беларускіх зямель не вылучаецца з агульнай масы дваранства [3].

Надзвычай карыснай для вывучэння інтэграцыі тытулаванай шляхты ў расійскае дваранства з'яўляецца праца Е. П. Карновіча [4]. Яна прысвечана паходжанню і эвалюцыі тытулаў расійскай арыстакратыі, у прыватнасці дэвальвацыі княскай годнасці ў Расійскай імперыі. Аўтар асабліва падкрэслівае колькаснае ўзбагачэнне расійскай арыстакратыі праз уключэнне ў яе шэрагі тытулаванай шляхты беларускіх зямель.

Важнай гістарыяграфічнай праблемай пры даследаванні працэсаў інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі з'яўляюцца праблемы генеалогіі і геральдыкі XIX ст. Першыя дазваляюць прасачыць не толькі гісторыю таго ці іншага рода, але і яго ўспрыняцце як роўнага, дастойнага завязаць шлюбныя сувязі з расійскім дваранствам. Генеалагічныя даследаванні князёў Далгарукага П. В. і Лабанава-Растоўскага А. Б. выдатна ілюструюць адзін са шляхоў інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад расійскага дваранства, у тым ліку факты параднення беларускай арыстакратыі з дынастыяй Раманавых [5, 6].

Шэраг даследчыкаў-геральдыстаў не абмінулі ў сваіх працах і нашу шляхту. А. Б. Лакіер, які вывучаў вытокі геральдычнай сістэмы Расійскай імперыі, у сваім даследаванні «Русская геральдика» асобна падкрэсліваў, што ўключэнне ў яе шляхты былой Рэчы Паспалітай значна ўзбагаціла расійскую геральдычную сістэму [7]. Даследчык выразна паказаў розныя вытокі геральдычных выяў, адзначаючы спецыфічнасць і разам з тым сістэматызаванасць «польскай» геральдыкі [80, с. 321–323]. Граф Бобрынскі А. А. прысвяціў сваю працу тым родам, якія былі ўнесены ў Агульны гербоўнік Расійскай імперыі [8]. Значнасць гэтай працы найперш у тым, што ў ёй паказаны не толькі паходжанне таго ці іншага дваранскага рода, але таксама і пасады, чыны, якімі валодалі тыя ці іншыя асобы. На аснове гэтага матэрыялу можна нават зрабіць высновы пра ступень даверу расійскіх уладаў да шляхты беларускіх зямель, аб тым, наколькі шчыльна набліжаліся асобныя яе прадстаўнікі да імператаскага двара.

Тытулаваным дваранскім фаміліям прысвечана даследаванне С. А. Васільевіча [9]. Заслуга аўтара ў тым, што ён без усялякай тэндэнцыйнасці ставіць у адзін шэраг з расійскай арыстакратыяй беларускія тытулаваныя шляхецкія роды, паказваючы тым самым, што дваранства Расійскай імперыі па меншай меры было адкрыта для інтэграцыі ў яго князёў, графаў і баронаў Рэчы Паспалітай, якая ўжо не існавала.

Сістэматызавалі афіцыйныя геральдычныя выданні В. К. Лукомскі і С. Н. Тройніцкі [10, 11]. Даследчыкі не толькі склалі спісы родаў, унесеных у Агульны гербоўнік, але прывялі іх гербавыя дэвізы і супаставілі Агульны гербоўнік з Гербоўнікам Царства Польскага.

У даследаваннях археографаў XIX ст. змяшчаюцца карысныя звесткі пра шляхту заходніх губерняў. І. Я. Спрогіс, А. Энгель не толькі апісвалі архівы, але і прывялі колькасны склад дваранства па заходніх губернях, цікавыя факты падробкі дакументаў на шляхецтва [12, 13]. Карысць гэтых даследаванняў у тым, што іх аўтары працавалі непасрэдна з дакументамі і на іх аснове рабілі высновы.

Адным з першых беларускіх гісторыкаў, які закранаў становішча шляхты беларускіх зямель, быў Доўнар-Запольскі М. В. [14]. Асноўныя яго даследаванні прысвечаны сярэдневякоўю, але ў сваёй абагульняючай працы «Гісторыя Беларусі» ён звяртае ўвагу і на гістарычныя абставіны ўключэння шляхты ў агульнаімперскую сацыяльную сістэму ў канцы XVIII–XIX ст. Даследчык справядліва адзначае двухбаковы лаялізм у адносінах шляхты і расійскіх уладаў, спецыяльна падкрэслівае, што цярпімае стаўленне да паланізацыі Беларусі ў першай палове XIX ст. не толькі стварыла глебу да антырасійскага руху, але і стрымлівала інтэграцыю шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі.

Савецкі перыяд развіцця айчыннай гістарыяграфіі вызначаецца тым, што вывучэнне сацыяльных вярхоў было ідэалагічна незапатрабаваным. Менавіта гэтым можна патлумачыць адносна невялікую колькасць прац па гісторыі шляхецкага саслоўя ў 20–80-я гг. XX ст. Тым не менш адзначым, што ў гэты перыяд з'явіліся асобныя грунтоўныя даследаванні, якія закранаі адзначаную праблематыку. Так, П. Г. Казлоўскі ў сваёй манаграфіі «Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в.» даследуе не толькі сялянскія надзелы і павіннасці, але і эвалюцыю землеўладання дробнай і заможнай шляхты, яе суадносіны па паветах, колькасны склад і пранікненне на тэрыторыю Беларусі землеўладальнікаў з унутраных губерняў Расійскай імперыі [15].

Развіццю губернскага самакіравання і цэнтральных дваранскіх і ўрадавых органаў прысвечана праца Я. П. Ярошкіна [16]. Аўтар не толькі прасочвае змены ў адміністрацыйным кіраванні на працягу XIX ст., але і падкрэслівае неабходнасць зменаў у сістэме дзяржаўных органаў у сувязі з вырашэннем шляхецкага пытання ў заходніх губернях Расійскай імперыі. Даследчык таксама паказвае, за якія заслугі перад дзяржавай можна было атрымаць дваранства.

Цікавасць уяўляюць даследаванні С. В. Думіна, у якіх аўтар не толькі звяртаецца да гісторыі асобных груп шляхецкага насельніцтва, але

і сістэматызуе пацверджанні дваранства беларускай шляхтай. У артыкуле, прысвечаным князям татарскага паходжання, даследчык паказвае, як выкарысталі яны сваё становішча для захавання тытулаў у Расійскай імперыі, з якімі перашкодамі сутыкнуліся [17]. Асобная манаграфія С. В. Думіна прысвечана гісторыі смаленскага дваранства [18]. У ёй аўтар паказвае асаблівае, памежкавае становішча смаленскага дваранства паміж шляхтай беларускіх зямель і карэнным расійскім дваранствам.

Вельмі важным і грунтоўным з'яўляецца даследаванне С. В. Думіна ў сааўтарстве з С. Гарзынскім [19]. Па сваёй сутнасці яно стала спробай стварэння не толькі справачнай сістэмы па прызнаннях дваранства ў Расійскай імперыі, але і вызначэння агульных тэндэнцый у гэтым працэсе. Адзіным, але вельмі істотным недахопам гэтага даследавання можна назваць адсутнасць у ім звестак па Віленскай губерні. Гэтым самым карціна інтэграцыі шляхты ў склад дваранства падаецца няпоўнай, што, аднак, усё ж дазваляе карыстацца працай як інфарматыўнай крыніцай.

З атрыманнем дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікай Беларусь павысілася цікавасць да гісторыі шляхецкага саслоўя і ў айчыннай гістарыяграфіі. Ужо ў сярэдзіне 1990-х гг. з'явіліся даследаванні становішча шляхты ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Так, у манаграфіі С. Л. Лугаўцовай даследуецца праблема палітыкі расійскага самадзяржаўя ў адносінах да дваранства Беларусі ў адзначаны перыяд [20]. Відавочная заслуга даследчыцы ў тым, што яна прасачыла не толькі ход і характар мерапрыемстваў па абмежаванні колькасці шляхты, але і яе ўдзел у самакіраванні. Паказана ў працы і схема пераходу часткі шляхты ў іншыя сацыяльныя групы, а таксама ўдзел яе ў антырасійскіх выступленнях. Недахопам даследавання стала, на наш погляд, залішняя ўвага да законаў, якія выдаваліся цэнтральным урадам. Справа ў тым, што далёка не ўсе яны выконваліся на практыцы, а іх уключэнне ў даследаванне надае яму фармальна-юрыдычны характар.

У артыкулах і дысертацыі Г. М. Туміловіч таксама аналізуецца становішча шляхты на Беларусі ў канцы XVIII– першай палове XIX ст. Заслугай аўтара з'яўляецца тое, што яна праводзіць выразны і абгрунтаваны падзел шляхты на дробную і заможную [21]. Надзвычай карыснымі ў даследаваннях вышэйшых сацыяльных слаёў грамадства сталі падлікі дынамікі колькасці шляхты Беларусі.

Гісторыі Беларусі ў часы царавання Кацярыны II прысвечаны даследаванні Я. К. Анішчанкі [22]. Даследчык удзяляе ўвагу не толькі становішчу шляхты Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, але і яе ўдзелу ў дваранскіх выбарах, злоўжываннях на іх.

Манаграфія В. В. Шведа «Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863)» мае высокую ступень інфарматыўнасці. Асабліва карысны, на наш погляд, яе часткай з'яўляецца гістарыяграфічны аналіз літаратуры, які прысвечаны праблемам гісторыі Беларусі ў часы яе знаходжання ў складзе Расійскай імперыі [23]. В. В. Швед вельмі крытычна падышоў да гістарыяграфічных аспектаў сваёй працы, як і да непасрэднага аб'екта даследавання. Адназначна важным у гэтай навуковай працы таксама з'яўляецца паказаная яе аўтарам зацікаўленасць уладаў ва ўваходжанні шляхты былой Рэчы Паспалітай у склад дваранства тых дзяржаў, якія ўключылі ў свой склад гэтыя землі.

Даследчык саслоўна-групавога складу сялянства Сосна У. А. звяртаецца да праблемы канфіскацыі шляхецкай маёмасці ў Расійскай імперыі ў канцы XVIII– пачатку XIX ст. [24]. Гэтае даследаванне пабудавана на разнастайных крыніцах, таму асабліва карыснымі для вывучэння праблемы інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі з'яўляюцца колькасныя паказчыкі канфіскацый.

Нельга абмінуць увагай даследаванні А. М. Лютага. Адно з іх, створанае ў сааўтарстве з В. Ф. Касовічам, прысвечана праблемам гістарыяграфіі і крыніц сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі ў другой палове XVIII– першай палове XIX ст. [25]. Гэта даследаванне карыснае тым, што ў ім праведзены аналіз і сістэматызацыя крыніц, у тым ліку па гісторыі шляхты. Яно скіроўвае патэнцыйных даследчыкаў да неабходнага матэрыялу, без выкарыстання якога даследаванне не можа прэтэндаваць на цэласнасць і аб'ектыўнасць.

Вядомы А. М. Люты таксама як аўтар манаграфіі «Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў Беларусі ў другой палове XVIII– першай палове XIX ст.» [26]. Гэта праца ўяўляе даследаванне, створанае на аснове шматлікіх крыніц. Яго аўтар прыходзіць да абгрунтаваных высноў пра дыферэнцыяцыю шляхецкага саслоўя, прасочвае змены яго колькасці на працягу даследуемага перыяду, ператварэнне часткі дробнай шляхты ў вольнанаёмных рабочых. На падставе аналізу статыстычных крыніц А. М. Люты даказаў іх недакладнасць, што з'яўляецца надзвычай важным пры вывучэнні колькасці дваран на беларускіх землях [26, с. 202–203].

Вывучэннем гісторыі сацыяльных груп насельніцтва Беларусі і іх прававога становішча займаюцца таксама гісторыкі права. Першынства ў такіх даследаваннях у айчыннай гісторыка-юрыдычнай школе належыць Я. І. Юхо.

У сваіх працах па гісторыі дзяржавы і права Беларусі аўтар звяртаецца да змен у становішчы шляхты пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі. У працах Я. І. Юхо прасочваецца палітыка расійскіх уладаў, накіраваная на памяншэнне абсалютнай колькасці шляхты. Увогуле даследчык з фармальна-юрыдычнага боку аналізуе эвалюцыю становішча насельніцтва беларускіх зямель [27].

Становішча шляхты на беларускіх землях разглядалася і ў даследаваннях польскіх гісторыкаў. Яшчэ ў XIX ст. пераважаў погляд, паводле якога шляхта беларускіх зямель уключалася ў склад польскай. Важнымі даследаваннямі па гісторыі асобных родаў з'яўляюцца генеалагічныя даследаванні Е. Дунін-Баркоўскага [28, 29]. Даследчык прыводзіць гісторыю тытулаваных родаў Рэчы Паспалітай. Яго працы дазваляюць прасачыць, якім чынам адбывалася інтэграцыя шляхты ў склад дваранства не толькі Расійскай імперыі, але і Прускага каралеўства і Аўстрыйскай імперыі.

Вялікая заслуга ў вывучэнні мерапрыемстваў урадаў краін, падзяліўшых Рэч Паспалітую, належыць У. Грабеньскаму. Аўтар «Гісторыі польскага народа» аб'ектыўна, арганічна аналізуе становішча, у якім апынуліся беларускія землі пасля іх далучэння да Расійскай імперыі [30]. Становішча шляхты беларускіх зямель у гэтым даследаванні параўноўваецца са становішчам шляхты, якая трапіла ў аўстрыйскае і прускае падданства. У. Грабеньскі справядліва адзначае больш мягкі характар расійскай палітыкі ў дачыненні да шляхты ў параўнанні з палітыкай Аўстрыі і Прусіі [30 с. 546]. Звяртаецца ён і да пытання ўдзелу шляхты ў антырасійскіх выступленнях.

Цікавыя звесткі таксама наконт шляхецкіх родаў можна знайсці ў 30-томным выданні «Złota księga szlachty polskiej» Т. Жыхлінскага [31]. Увогуле ў гістарыяграфічным аглядзе нельга не ўлічыць шэраг неафіцыйных, але вельмі цікавых гербоўнікаў, створаных іншымі польскімі аўтарамі – Банецкім А., Нясецкім К., Хржаньскім Ю., Урускім С. [32, 33, 34, 35]. Яны ўяўляюць сабой даследаванні прыналежнасці шляхецкіх родаў (у тым ліку з Беларусі) да тых ці іншых гербаў. Важнасць выказаных у іх высноў пацвярджаецца хаця б ужо выкарыстаннем гэтых выданняў нават афіцыйнымі царскімі ўладамі ў працэсе разгляду дакументаў наконт шляхецкага паходжання дваранства заходніх губерняў.

Польскія даследчыкі ў далейшы перыяд таксама прытрымліваліся меркавання пра прыналежнасць шляхты Беларусі да польскай. Такі погляд знайшоў адлюстраванне ў працах Л. Жытковіча, І. Сікорскай-Кулешы, І. Рыхлінковай [36, 37, 38, 39]. Тым не менш адзначаныя даследаванні карысныя пры вывучэнні «разбораў» шляхты і іх сувязі з антырасійскімі выступленнямі.

Пахожданню тытулаў на беларускіх землях прысвечаны працы Ш. Канарскага [40]. Даследчык дастаткова аб'ектыўна раскрывае фактары, якія ўплывалі на з'яўленне тытулаваных родаў.

А. Халецкі разглядае шляхту Рэчы Паспалітай пасля яе падзелаў праз прызму расійскага імперыялізму [41].

**Заключэнне.** Такім чынам, існуючая навуковая літаратура пра шляхту беларускіх зямель у Расійскай імперыі ў асноўным закранае пытанні генеалагічна-геральдычнага характару, удзелу шляхты ў сепаратысцкім антырасійскім руху і эксплуатацыі ёй як землеўласнікам залежнага ад яе насельніцтва. Большасць узгаданых навуковых даследаванняў закранаюць разнастайныя праблемы гісторыі мясцовага дваранства ў кантэксце іншых пытанняў, звязаных з гэтай сацыяльнай групай.

## Літаратура

1. Романович-Словатинский А. М. Дворянство в России. Киев: изд. И. Н. Кнебель, 1912. 324 с.

2. Корф С. А. Дворянство и его сословное управление за столетие (1762–1855 гг.). СПб.: Тип. Тренке и Фрюсно, 1906. 168 с.

3. Яблочков М. История дворянского сословия в России. СПб.: Тип. А. М. Котомина, 1876. 198 с.

4. Карнович Е. П. Родовые прозвания и титулы в России и слияние иноземцев с русскими. СПб.: Тип. А. С. Суворина, 1886. 249 с.

5. Долгорукий П. В. Российская родословная книга. В 4 ч. СПб.: Тип. К. Вингебера, 1854–1857. Ч. 1. 550 с.

6. Лобанов-Ростовский А. Б. Русская родословная книга. СПб.: Тип. А. С. Суворина, 1895. 481с.

7. Лакиер А. Б. Русская геральдика. М.: Книга, 1990. 432 с.

8. Бобринский А. А. Дворянские роды, внесенные в «Общий гербовник Всероссийской империи». В 2 т. СПб.: Тип. М. М. Стасюлевича, 1890. Т. 2. 798 с.

9. Васильевич С. А. Титулованные роды Российской империи. СПб.: Тип. т-ва «Общественная польза», 1910. 296 с.

10. Лукомский В. К., Тройницкий С. Н. Списки лицам, высочайше пожалованным дипломами с гербами на дворянское достоинство Всероссийской империи и Царства Польского. СПб.: Тип. Сириус, 1911. 54 с.

11. Лукомский В. К., Тройницкий С. Н. Указатели к Высочайше утвержденным Общему гербовнику дворянских родов Всероссийской империи и Гербовнику дворянских родов Царства Польского. СПб.: Тип. Сената, 1910. 12 с.

12. Спрогис И. Я. Виленский центральный архив древних актовых книг. Вильна: Губернская типография, 1901. 8 с.

13. Энгель А. Описание дел, хранящихся в архиве Виленского генерал-губернаторства. В 2 т. Т. 1. Ч. 1 (1783–1791). Вильна: Тип. М. Р. Ромма, 1869. 984 с.

14. Довнар-Запольский М. В. История Белоруссии. Минск: Беларусь, 2003. 680 с.

15. Козловский П. Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII– первой половине XIX века. Минск: Наука и техника, 1982. 206 с.

16. Ерошкин Е. П. История государственных учреждений дореволюционной России. М.: Высш. шк., 1983. 352 с.

17. Думин С. В. Татарские князья в Великом княжестве Литовском // Acta Baltico-Slavica. Wroclaw, 1991. С. 23–46.

18. Смоленское дворянство / под науч. ред. С. В. Думина. М.: Изд-во Смолен. дворян. землячества, 1999. 45 с.

19. Dumin S., Górzyński S. Spis szlachty wylegitymowanej w guberniach Grodzińskiej, Mińskiej, Mohulewskiej, Smoleńskiej i Witebskiej. Warszawa: Fundacja im. Ciechanowieckich, 1992. 112 s.

20. Луговцова С. Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII– первой половине XIX века. Минск: БГПУ им. М. Танка, 1997. 78 с.

21. Туміловіч Г. М. Дваранства Беларусі ў канцы XVIII– першай палове XIX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 4. С. 54–57.

22. Анішчанка Я. К. Дваранскія выбары ў Полацкім намесніцтве 1789 г. // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. 1992. № 3–4. С. 67–74.

23. Швед В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863). Гродна: ГрДУ, 2001. 415 с.

24. Сосна У. А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII– першай палове XIX ст. Мінск: БДУ, 2000. 115 с.

25. Касовіч В. Ф., Люты А. М. Гістарыяграфія і крыніцы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XVIII– першай палове XIX ст. Мінск: БДПУ, 1996. 93 с.

26. Люты А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў Беларусі ў другой палове XVIII– першай палове XIX ст. Мінск: БДПУ, 2004. 320 с.

27. Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. У 2 ч. Мінск: РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1. 352 с.

28. Dunin-Borkowski J. Almanach blekitny. Genealogie zyjacych rodow polskich. Lwow: Ks. H. Altenberga, 1908. 767 s.

29. Dunin-Borkowski J. S. Genealogie utytulowanych rodow polskich. Lwow: Ks. H. Altenberga, 1895. 602 s.

30. Грабеньский В. История польского народа. Минск: МФЦП, 2006. 800 с.

31. Zychlinski T. Złota księga szlachty polskiej. 1–31, Poznań: J. Leitgeber, 1879–1908. T. 7. 1885. 121 s.

32. Boniecki A. Herbarz Polski. Warszawa: Gebethner i Wolff, 1899–1909. 13 t. T. 13. 1909. 404 s.

33. Chrzański J. Tablice odmian herbowych Chrańskego. Warszawa: Juliusz Ostrowski, 1909. 66 s.

34. Niesiecki K. Herbarz Polski. Lipsk: wyd. J. N. Bobrowicz, 1845. 679 s.

35. Uruski S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej. Warszawa: Gebethner i Wolff, 1904. 207 s.

36. Rychlinkowa J. Carat wobec polskiej szlachty na ziemiach zabranych w latach 1772–1831 r. // Kwartalnik historyczny. 1991. № 3. S. 34–57.

37. Sikorska-Kulesza J. Drobna szlachta w zachodniej Białorusi na Litwe w XIX w. Warszawa: AJAKS, 1990. 235 s.

38. Sikorska-Kulesza J. Deklasacja drobnej szlachty na Litwe i Białorusi w XIX w. Warszawa: AJAKS, 1995. 304 s.

39. Zytkowicz L. Rządy Repnina na Litwe w latach 1794–1797. Wilno: Towarzystwo Przyjaciów Nauk w Wilnie, 1938. 264 s.

40. Konarski S. O heraldyce i heraldycznym snobizmie. Warszawa: Adiutor, 1992. 315 s.

41. Halecki O. Imperialism in Slavic and East European History // American Slavic East European Review. 1952. № 11. P. 1–26.

## References

1. Romanovich-Slovatinskiy A. M. *Dvoryanstvo v Rossii* [Nobility in Russia]. Kiev, I. N. Knebel Publ., 1912. 324 p.

2. Korf S. A. *Dvoryanstvo i yego soslovnoye upravleniye za stoletiye (1762–1855 gg.)* [The nobility and its estate management over the century (1762–1855)]. St. Petersburg, Tip. Trenke i Fryusno Publ., 1906. 168 p.

3. Yablochkov M. *Istoriya dvoryanskogo sosloviya v Rossii* [History of the nobility in Russia]. St. Petersburg, Tip. A. M. Kotomina Publ., 1876. 198 p.

4. Karnovich E. P. *Rodovyye prozvaniya i tituly v Rossii i sliyaniye inozemtsev s russkimi* [Family names and titles in Russia and the merger of foreigners with Russians]. St. Petersburg, Tip. A. S. Suvorina Publ., 1886. 249 p.

5. Dolgorukiy P. V. *Rossiyskaya rodoslovnaya kniga* [Russian genealogy book]. St. Petersburg, Tip. K. Vingebera Publ., 1854–1857. Part. 1. 550 p.

6. Lobanov-Rostovskiy A. B. *Russkaya rodoslovnaya kniga* [Russian genealogy book]. St. Petersburg, Tip. A. S. Suvorina Publ., 1895. 481 p.

7. Lakiyer A. B. *Russkaya geral'dika* [Russian heraldry]. Moscow, Kniga Publ., 1990. 432 p.

8. Bobrinskiy A. A. *Dvoryanskiye rody, vnesennyye v «Obshchiy gerbovnik Vserossiyskoy imperii»* [The noble birth brought into the "General Stamp of the All-Russian Empire"]. St. Petersburg, Tip. M. M. Stasyulevicha Publ., 1890. Vol. 2. 798 p.

9. Vasil'yevich S. A. *Titulovannyye rody Rossiyskoy imperii* [The titled clans of the Russian Empire]. St. Petersburg, Tip. t-va "Obshchestvennaya pol'za" Publ., 1910. 296 p.

10. Lukomskiy V. K., Troynitskiy S. N. *Spiski litsam, vysochayshe pozhalovannym diplomami s gerbami na dvoryanskoye dostoinstvo Vserossiyskoy imperii i Tsarstva Pol'skogo* [Lists to persons highly granted diplomas with emblems for the noble dignity of the All-Russian Empire and the Kingdom of Poland]. St. Petersburg, Tip. Sirius Publ., 1911. 54 p.

11. Lukomskiy V. K., Troynitskiy S. N. *Ukazateli k Vysochayshe utverzhdennym Obshchemu gerbovniku dvoryanskikh rodov Vserossiyskoy imperii i Gerbovniku dvoryanskikh rodov Tsarstva Pol'skogo*. [Pointers to the highest approved general gerbovnik noble birth of the all-Russian empire and the gerbovnik noble birth of the Polisk kingdom] St. Petersburg, Tip. Senata Publ., 1910. 12 p.

12. Sprogis I. Y. *Vilenskiy tsentral'nyy arkhiv drevnikh aktovykh knig* [Vilensky Central Archive of Ancient Act Books]. Vil'na, Gubernskaya Tipografiya Publ., 1901. 8 p.

13. Engel' A. *Opisaniye del, khranyashchikhsya v arkhive Vilenskogo general-gubernatorstva* [Description of cases stored in the archives of the Vilna Governor General]. Vil'na, Tip. M. R. Romma Publ., 1869. Vol. 1 (1783–1791). 984 p.

14. Dovnar-Zapol'skiy M. V. *Istoriya Belorussii* [History of Belarus]. Minsk, Belarus' Publ., 2003. 680 p.

15. Kozlovskiy P. G. *Zemlevladeniye i zemlepol'zovaniye v Belorussii v XVIII– pervoy polovine XIX veka* [Land ownership and land use in Belarus in the XVIII – the first half of the XIX century]. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1982. 206 p.

16. Yeroshkin E. P. *Istoriya gosudarstvennykh uchrezhdeniy dorevolyutsionnoy Rossii* [History of state institutions of pre-revolutionary Russia]. Moscow, Vysshaya shkola Publ., 1983. 352 p.

17. Dumin S. V. Tatar princes in the Grand Duchy of Lithuania. *Acta Baltico-Slavica*. 1991, pp. 23–46.

18. Dumin S. V. *Smolenskoye dvoryanstvo* [Smolensk nobility]. Moscow, Izdatel'stvo Smolenskogo dvoryanskogo zemlyachestva Publ., 1999. 45 p.

19. Dumin S., Górzyński S. *Spis szlachty wylegitymowanej w guberniach Grodzińskiej, Mińskiej, Mohulewskiej, Smoleńskiej i Witebskiej* [List of ID cards in Grodno, Minsk, Mohilew, Smolensk and Vitebsk Governments]. Warsaw, Fund. Ciechanowieckich Publ., 1992. 112 s.

20. Lugovtsova S. L. *Politika rossiyskogo samoderzhaviya po otnosheniyu k dvoryanstvu Belorussii v kontse XVIII– pervoy polovine XIX veka* [The policy of the Russian autocracy in relation to the nobility of Belarus in the late XVIII– first half of the XIX century]. Minsk, BGPU im. M. Tanka Publ., 1997. 78 p.

21. Tumilovich G. M. Nobility of Belarus at the end of XVIII– the first half of the XIX century. *Bielaruski gistarychny chasopis* [Belarusian historical magazine], 1997, no. 4, pp. 54–57.

22. Anishchanka J. K. Noble governorship election in Polotsk 1789. *Viestsi Akademii navuk Bielarusi. Sieryya gramadskikh navuk* [News of the Academy of Sciences of Belarus. A series of social sciences], 1992, no. 3–4, pp. 67–74.

23. Shved V. V. *Pamizh Pol'shchay i Rasiyay: gramadska-palitychnaye zhytstse na zemlyakh Belarusi (1772–1863)* [Between Poland and Russia: Social and political life on the Belarusian land (1772–1863)]. Grodno, GrDU Publ., 2001. 415 p.

24. Sosna U. A. *Farmiravanne saslouna-grupavoga skladu syalyanstva Belarusi u kantsy XVIII– pershay palove XIX st.* [Formation of the caste-group composition of the peasantry of Belarus at the end of XVIII– first half of XIX century]. Minsk, BDU Publ., 2000. 115 p.

25. Kasovich V. F., Liuty A. M. *Gistaryyagrafiya i krynitsy satsyyal'na-ekanamichnaga razvitstsya Belarusi u drugoy palove XVIII– pershay palovye XIX st.* [Historiography and sources of socio-economic development of Belarus in the second half of XVIII– the first half of the XIX century]. Minsk, BDPU Publ., 1996. 93 p.

26. Liuty A. M. *Satsyyal'na-ekanamichnaye razvitstse u Belarusi u drugoy palove XVIII– piershay palove XIX st.* [Socio-economic development of Belarus in the second half of the eighteenth century – the first half of the XIX century]. Minsk, BDPU Publ., 2004. 320 p.

27. Jucho J. A. *Gistoryya dziarzhavy i prava Belarusi* [History of State and Law of Belarus]. Minsk, RIVSH BDU Publ., 2000. Vol. 1, 352 p.

28. Dunin-Borkowski J. *Almanach blue. Genealogies of living Polish pedigrees*. Lviv, H. Altebberg Publ., 1908. 767 s.

29. Dunin-Borkowski J. S. *Almanach blekitny. Genealogie zyjacych rodow polskich.* Lviv, H. Altebberg Publ., 1895. 602 s.

30. Graben'skiy V. *Istoriya pol'skogo naroda* [History of the Polish people]. Minsk, MFTSP Publ., 2006. 800 p.

31. Zychlinski T. *Złota księga szlachty polskiej.* Poznań, J. Leitgeber Publ., 1875. Vol. 7. 121 s.

32. Boniecki A. *Herbarz Polski*. Warsaw, Gebethner and Wolff Publ., 1899–1909. Vol. 13. 404 s.

33. Chrzański J. *Tablice odmian herbowych Chrańskego*. Warsaw, J. Ostrowski Publ., 1909. 66 s.

34. Niesiecki K. *Herbarz Polski*. Leipzig, ed. J. N. Bobrowicz Publ., 1845. 679 s.

35. Uruski S. *Herbarz szliachty polskiej*. Warsaw, Gebethner & Wolff Publ., 1904. 207 s.

36. Rychlinkowa J. Carat towards the Polish nobility in the lands taken in the years 1772–1831. *Kwartalnik historyczny*. 1991, no. 3, ss. 34–57.

37. Sikorska-Kulesza J. *Drobna szlachta w zachodniej Białorusi na Litwe w XIX w.* Warsaw, AJAKS Publ., 1990. 235 s.

38. Sikorska-Kulesza J. *Deklasacja drobnej szlachty na Litwe i Białorusi w XIX w.* Warsaw, AJAKS Publ., 1995. 304 s.

39. Zytkowicz L. *Rządy Repnina na Litwe w latach 1794–1797.* Vilnius, Towarzystwo Przyjaciów Nauk in Wilno Publ., 1938. 264 s.

40. Konarski S. *O heraldyce i heraldycznym snobizmie*. Warsaw, Adiutor Publ., 1992. 315 s.

41. Halecki O. Imperializm v slavyanskoy i vostochnoyevropeyskoy istorii. *American Slavic East European Review.* 1952, no. 11, pp. 1–26.

**Інфармацыя пра аўтара**

**Дамарад Аляксей Анатольевіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і палітологіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: domorad@belstu.by

**Information about the author**

**Damarad Aliaksei Anatolievich** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: domorad@belstu.by

*Паступіў 11.03.2020*